

Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

ВЕРАСЕНЬ 2015 г. **№ 6 (56)**

НАВІНЫ РЭГІЁНА

Петр Елфимов и белыничский музыкант Юрий Нестеренко записали кавер-версию хита “Have you ever seen the rain?” группы Creedence Clearwater Revival на белорусском языке. Автор произведения Джон Фогерти дал личное согласие на исполнение кавер-версии. Песня получила название “Мару бачыць гэты дождж”. Автор белорусского текста - Юрий Нестеренко.

На 63 млн. рублей оштрафовали экс-директора одного из предприятий Шкловского района за служебный подлог.

Суд накануне вынес приговор в отношении 60-летнего жителя Круглянского района за преступления против интересов службы. Теперь уже бывший руководитель ЗАО «Полыковичское», требовал, чтобы его подчиненные вносили заведомо ложные сведения в официальные документы. Таким образом он хотел избежать ответственности за падеж скота и создать видимость благоприятной экономической обстановки на предприятии. Всего было установлено 43 факта должностного подлога, рассказала старший помощник прокурора Могилевской области советник юстиции Алла Кузнецова. За совершенное преступление суд назначил недобросовестному руководителю наказание в виде штрафа в размере 350 базовых величин. Обвиняемый с приговором не согласился и обжаловал его в Могилевском областном суде. Однако судебная коллегия по уголовным делам приговор оставила без изменения, а жалобу обвиняемого - без удовлетворения, сообщает радио «Могилев».

НУ, ЗА ВЫБАРЫ!

Кіраўнік “квітнеючай Беларусі” Аляксандр Лукашэнка на працягу апошняга месяца зрабіў цэлы шэраг цікавых заяў.



У прыватнасці, Аляксандр Рыгоравіч нарэшце прызнаўся, што пасля 21 года яго нязменнага праўлення ў краіне фактычна скончыліся грошы, каб падтрымліваць стабільны курс беларускага рубля. “Я вам клянусь, что мы ничего не делаем, чтобы сдерживать или же усиливать, или ослаблять национальную валюту. Будет больше валюты — будет ниже курс, будет высокий спрос, валюты не будет — вы знаете, что будет», - заявіў кіраўнік краіны на сустрэчы з працаўнікамі прадпрыемстваў.

Яно і не дзіўна, адкуль тым буржуінскім грашам узяцца, калі большасць прадпрыемстваў дыхае на ладан, бо “вельмі якасную” беларускую прадукцыю не хочуць купляць нават свае браткі-беларусы, не кажучы ўжо пра “загніваючых” капіталістаў з Захаду, ці “братоў” з Усходу, якія самі зараз не ведаюць, як пасля “Нашага Крыма” вычапаць.

Мне, праўда, усё ж крыху дзіўна, чаму Аляксандр Рыгоравіч стараецца не ўзгадваць, што ў 2010 годзе, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, “варожы” долар каштаваў 3 000 рублёў, ну а зараз ужо 17 500. Не хоча наш любімы кіраўнік таксама ўспамінаць і пра тое, што ён асабіста напярэдадні тых жа прэзідэнцкіх выбараў 2010 года абяцаў нам сярэдні заробак у 2015 годзе ў памеры 1 000 гэтых самых зялёных паперак…

Менавіта ж ён кіраваў краінай усе гэтыя пяць гадоў, ці, магчыма, я памыляюся?

Ды яно і зразумела, што пра гэта ўспамінаць, ці мала ён чаго там нам абяцаў. Галоўнае, каб не было вайны, праўда?

Таму зараз Рыгоравіч і заклікаў неразумных беларусаў, наведваючы Баранавічы, - “Давайте наше, белорусское, поносим! Пускай лучше оно будет немножко не тех мод, без дырок на коленях. Как сейчас штаны носят?

(Заканчэнне на стар. 8)

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ КАМПАНИЯ В РЕГИОНАХ: ОБРЕЧЕНЫ ЖИТЬ С ЛУКАШЕНКО

Президентская избирательная кампания не вызывает особого ажиотажа в белорусской провинции. О ее особенностях на примере Могилевской области рассказывает корреспондент DW.



Подготовка к президентским выборам в Беларуси вышла на финишную прямую: 26 августа закончилось формирование участковых избирательных комиссий, после официальной регистрации Центризбиркомом кандидатов в президенты останется лишь этап агитации и непосредственно само голосование 11 октября. Однако улицы Могилева до сих пор вовсе не пестрят плакатами - ни власти, ни оппозиция не проявляют активности, похоже, что уже сейчас никто не сомневается в победе бессменного президента Беларуси Александра Лукашенко, баллотирующегося на пятый срок.

Подписи за президента

Конец этапа сбора подписей за выдвижение кандидатов на пост главы государства ознаменовался в Могилеве скандалом. Профсоюзный активист Алексей Павловский, собиравший подписи за одного из оппозиционных претендентов, выявил, что жители общежитий могилевских промышленных предприятий вынуждены были подписаться за действующего президента, даже не предъявив документов.

По закону, поясняет Павловский, гражданин должен вписать в подписной лист свои паспортные данные и адрес проживания, а потом поставить дату и подпись. Но агитаторы за нынешнего президента явились в общежития с уже готовыми списками его жильцов, в которых стояли и номера паспортов, и адреса - оставалось лишь расписаться.

Алексей Павловский считает, что этот пример объясняет отношение властей к избирателям в провинции. Это, по его выражению, стандартная практика, давно отработанная на предыдущих выборах: отделы кадров выписывают данные из личных дел своих работников и заставляют их подписываться за нужного претендента, угрожая проблемами, например, с жильем. По факту нарушений активист, конечно, написал ряд жалоб в соответствующие инстанции, но ответ на них, судя по всему, придет, когда кампания уже закончится.

Ряды оппозиционеров редеют

Руководитель городской организации Партии БНФ Валентина Щетникова напоминает, что в Могилеве произошел еще один инцидент: во время сбора подписей за Татьяну Короткевич в одном из микрорайонов Щетникову вместе с коллегой задержал ОМОН из-за наличия бело-красно-белого флага на пикете. Лишь в центре города, признает глава городской организации ПБНФ, милиционеры были предупредительны и аккуратны. Но стоило лишь переместиться в спальный район, и там уже другие правила.

Милицейское начальство позже извинилось перед активистами оппозиции, но этот факт, считает Валентина Щетникова, показывает, что "перемирие лишь временное".

Среди особенностей нынешней избирательной кампании Щетникова отметила увеличение числа могилевчан, которые, выражая симпатии оппозиционным лидерам, все же отказывались ставить свою подпись в их поддержку, опасаясь возможных репрессий. А вот молодежь, приехавшая в город из маленьких райцентров, наоборот, подписывалась активно.

В малых городах, объясняет Щетникова, страха меньше, так как там все друг друга знают, и милиционеры предпочитают решать проблемы так, чтобы потом соседи не показывали на них пальцем. Но там есть другая проблема - в глубинку оппозиционеры не доехали, так как в райцентрах не на кого опереться: старые оппозиционные активисты уходят, а притока новых сил нет.

Кандидатов не знают

Еще одной особенностью нынешних президентских выборов лидер областной организации Объединенной гражданской партии (ОГП) Владимир Шанцев считает полное незнание избирателями претендентов на президентский пост.

По телевизору вроде говорят, что будут выборы, и восемь человек изъявили желание побороться за президентское кресло, продолжает Шанцев, но при этом показывают лишь одного - Александра Лукашенко. О других претендентах говорят либо вскользь и плохо, либо вообще ничего. Это сказывается на настроениях населения, сетует Шанцев.

(Окончание на стр. 5)

БОМЖИ ПОНЕВОЛЕ?

За последние годы Жилищный Кодекс РБ переделывался несколько раз и, у меня лично складывается впечатление, что всё это делалось для того, чтобы в нашей стране социальной справедливости наконец-то появились бомжи (люди без определённого места жительства). Кто эти люди? Почему нам кажется, что в нашем маленьком и спокойном Круглом этого явления нет? Я опишу несколько случаев, когда мне приходилось сталкиваться с такими людьми, которых «породили» изменения в ЖК РБ.



Зинаида Милещенко

Саша. Сравнительно молодой человек, юность и молодость которого прошла в «местах не столь отдалённых». В своё время он отбывал наказание в Круглом «на поселении», как говорят у нас. И когда подошло время возвращения домой, а там его никто не ждал, он решил вопрос так же, как и многие его предшественники. Он нашёл молодящуюся дуру лет на двадцать за себя старше, и сел альфонсом ей на шею. Родственники через суд выселили его из могилёвской квартиры, у родственников его пожилой супруги хватило ума не дать ей согласие на регистрацию в её квартире её «сердечного друга», вот он без регистрации и поселился на «даче» в близлежащей деревне, в которой от такого соседства не в восторге. Так как и без того в пьющей деревне появилась ещё и «блатная хата», то двери соседних домов укрепились дополнительными замками. Ведь мужчина сидел за профессию, которую с лёгкой руки известного фильма называют «джентльменами удачи». А что же правоохранительные органы, которые должны отслеживать данный контингент таких личностей? Как всегда, ждут «сигнала» о новом преступлении новоявленного бомжа. Профилактикой преступлений им заниматься некогда.

Слава. Это вообще интересная личность, уникальная в своём роде, которая умудрилась прожить более 15 лет в родительском доме за счёт своей матери, не выплачивая алименты на сына. Более того, жена отказалась от алиментов, так как постаралась оградить в будущем сына от такого горе-отца. Ведь пенсия, которую он «заработал», составляет всего порядка 1 300 000 рублей. Так вот какой парадокс: человек прожил за счёт общества всю свою жизнь, но благодаря головотяпству чиновников приобрёл право требовать жильё за счёт государства. Более 15 лет он оставался прописанным» в помещении, которое трудно назвать жильём, в доме, которому более 100 лет. И за это время он, хотя ничего и не оплачивал, сохранил регистрацию, а значит и право на получение более достойного жилья. Хотя, в общем-то, не заслужил не только его, но даже был выселен из родительского дома наследниками, так как из-за природной лени не ухаживал за прилегающей территорией, и абсолютно справедливо его племяннику был выписан штраф за ненадлежащее обслуживание жилого дома. Но этому бомжу в какой-то мере повезло, и он доживёт свой век под крышей, хотя после 2016 года, при переводе муниципального жилья на арендную оплату, вряд ли со своей пенсии сможет его оплачивать. И в скором времени будет жить снова на улице. А что же те чиновники, которые вовремя не выписали гражданина из аварийного жилья? По-прежнему сидят на своих местах и получают зарплату, которая от их головотяпства не зависит.

Валера. В отличие от двух первых, знакомство с ним вызывает у меня пусть не интерес, но хотя бы симпатию. Семью потерял из-за пристрастия к алкоголю, что не редкость в нашем обществе. Жена уплатила ему за построенный совместно дом. Купленный в деревне на эти деньги дом сгорел. Сожительница умерла неожиданно. Её дети выселили мужчину из занимаемого жилья. Поселился в квартире совхоза, в котором в тот момент работал. Привёл квартиру в относительный порядок. Но руководство СПК решило выселить бывшего работника из занимаемого жилья. Подало в суд. Самое смешное, при этом не имея документов на двухквартирный дом. Потеряли документы нерадивые чиновники. Кстати, таких домов по Круглому не один десяток, которые или заняты, или пустуют, но формально за кем-то числятся, но на них нет документов. Этот бомж отстаивает свои права на жильё в суде. Я думаю, что суд откликнется на его проблему и оставит за ним право занимать в этом старом доме квартиру. Квартиру он планирует отремонтировать, и даже собирается после этого пойти на работу. Хотя найти ему эту работу будет очень трудно. Человек болен туберкулёзом.

Сергей. В прошлом «перекати поле». Бывший военный. Бывший муж. Бывший отец. Проживал с семьёй в доме, где и был зарегистрирован даже после того, как дом снесли. Имущество перевезли в склад ЖКХ, где и раскрали. После возвращения домой сдал паспорт на обмен и перерегистрацию. Но документ был в паспортном столе потерян.

(Окончание на стр. 4)

БОМЖИ ПОНЕВОЛЕ?



(Оконч. Начало на стр. 3)

(Хотя это очень странно). На руках у гражданина осталась справка о сдаче паспорта, которую пытались изъять, но у него хватило ума оставить её при себе. Несколько месяцев пытается получить документы, т.е. паспорт, но какая-то волокита работников Круглянского РОВД мешает этому знаменательному событию. Живёт Сергей у знакомых, перебивается случайными заработками. Оптимист. Ни к кому претензий, кроме начальника паспортного стола не имеет, надеется в будущем получить квартиру, так как, хотя дома нет, снесли, но регистрацию работники ЖКХ вовремя не оспорили, так же как и в случае со Славой, и будут вынуждены обеспечить и его муниципальным жильём.

Что объединяет этих людей? Они почти все одного возраста. Они мужчины. Более или менее склонные к алкоголю. Не нашедшие себя, невостребованные обществом. В общем-то, типичные представители постсоветской Беларуси. Таких вот скрытых «бомжей» на самом деле ещё больше. Они проживают в семьях, издеваясь над бывшими или состоящими в браке жёнами, калеча судьбы детей и порождая себе подобных. «Стрекозлы» рождают «стрекозлов».

А что же делают наши чиновники? Те, что по долгу службы и по получаемой зарплате обязаны следить за тем, чтобы общество было здорово? Какую альтернативу могут они предложить спивающемуся населению? Спорт? Не смотря на то, что у нас очень хороший стадион, людей на нём можно увидеть только во время редких футбольных матчей. В другие дни он пустует, хотя отдел спорта при Круглянском райисполкоме регулярно получает зарплату. За какую работу?

Дом культуры? Он уже не один десяток лет работает, как и другие организации района, с 8-00 до 18-00. Не пытайтесь найти здесь приют в вечернее время. Вы не найдёте ничего, чтобы отвечало вашим интересам. Отдел культуры давно стал мини-филармонией, обслуживающей интересы правящей верхушки района. Может, на бумаге и проводится работа, но в основном всё давно пущено на самотёк. Организация, где люди просто зарабатывают деньги.

Работники РОВД? Давно уже они работают только тогда, когда получат «бумажку» с заявлением. Профилактика сведена до минимума. У меня сложилась впечатление, что эта служба стала помощником в деле взимания штрафов с оплошавших пенсионеров. Иногда они не только лжесвидетельствуют против старух и стариков, но и специально провоцируют их, чтобы побольше собрать штрафов. Вместо работы с населением милиция стала дополнительным органом по собиранию денег в обнищавший районный бюджет.

Вот и получается, что вроде бы все чиновники, которые, по долгу службы, должны думать о здоровом обществе, работают, как муравьи, а на деле ничем не отличаются от «стрекозлов», которые никакой пользы обществу не приносят, но в отличие от этих вторых они находятся на обеспечении государства. Общество содержит и тех, и других. И ещё неизвестно, кто из них приносит больше вреда: те, что прожигают свою жизнь бесполезно, или те, которым мы за бесполезность платим.

БОМЖ. Бесполезный объект мнимой жизни.

Зинаида Милещенко

ГАИ информирует

28 августа в 23-50 в Белыничском районе 22-летний могилевчанин, управляя автомашиной «Хонда Цивик», на 176-ом километре автодороги Минск–Могилев совершил наезд на 21-летнего жителя деревни Ермоловичи, который двигался на велосипеде по краю проезжей части (фото 3). В результате ДТП велосипедист получил смертельную травму.

30 августа в 18-50 в городском поселке Круглое 18-летний житель деревни Грибино, управляя автомашиной «Фольксваген Пассат», возле дома №13 по улице Заслонова на закруглении дороги вправо не выбрал безопасную скорость движения, не учел дорожные условия, в результате его автомобиль занесло, и он опрокинулся на проезжей части. Водитель и его пассажир, 23-летний односельчанин, с различными травмами госпитализированы. Спустя несколько часов водитель в больнице скончался. Ремнями безопасности пристегнуты не были.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ КАМПАНИЯ В РЕГИОНАХ: ОБРЕЧЕНЫ ЖИТЬ С ЛУКАШЕНКО

(Оконч. Начало на стр. 2)

Могилевчане подходили к пикету в поддержку председателя ОГП Анатолия Лебедько, выражали недовольство политикой Лукашенко, но не подписывались за выдвижениие Лебедько из-за того, что "все давно уже решено". "Впервые за последние четверть века я наблюдаю такую уверенность людей в фальсификации результатов будущего голосования", - сокрушается Владимир Шанцев.



Все те же лица

Сомневается в честности подсчета голосов и наблюдатель от Могилевского правозащитного центра Борис Бухель. Он обращает внимание на то, что состав как территориальных, так и участковых избирательных комиссий на 70 процентов сформирован из тех же людей, что входили в них и на прошлых выборах. В Могилеве в избирательные комиссии не попал ни один оппозиционер. Прошлые выборы, проведенные этими людьми, напоминает Бухель, не соответствовали демократическим стандартам, а значит, есть сомнения, что нынешние пройдут честно.

Зампредседателя Белорусской социал-демократической партии (Грамада) Игорь Борисов указывает, что в регионах вообще нет ощущения проведения крупной политической кампании. Могилев даже внешне выглядит уныло: о дате выборов предупреждают лишь полдесятка билбордов и объявления, вывешенные на дверях некоторых магазинов. Ни оппозиция, ни власть не проявляют никакой активности. Политик объясняет это двумя причинами.

Во-первых, оппозиция не смогла выдвинуть единого кандидата, и народ ответил апатией. Во-вторых, власть с помощью административного ресурса собрала около 2 миллионов подписей за Александра Лукашенко и в никакой агитации больше не нуждается.

Касаясь настроений избирателей в провинции, практически все опрошенные DW местные политики сошлись во мнении, что никаких возможностей оценить такие настроения нет ни у властей, ни у оппозиции. В демократических странах, заметил Шанцев, проводятся соцопросы, но в нынешней Беларуси они бессмысленны.

Отвечая на вопросы о политике, жители глубинки уходят от прямого ответа, или говорят не то, что думают - это, пожалуй, заключил Шанцев, и есть единственный индикатор, который характеризует сложившуюся в стране атмосферу.

Александр Бураков, Могилев

Из сводки УВД

24 августа СК возбуждено уголовное дело по ст. 205 ч. 2 Уголовного Кодекса (Кража) в отношении неработающих, не судимых, жителей д. Пригани-2 Круглянского района, 1991 и 1990 г.р., которые 19 июля около 14-00 из сарая односельчанина, 1970 г.р., путем свободного доступа,похитили металлический водогрейный котел стоимостью 3 612 386 руб. Раскрыто ОУР. Похищенное изъято.

26 августа СК возбуждено у/д по ст. 205 ч. 2 УК (Кража) в отношении жителя г.п. Белыничи, 1998 г.р., жителя а.г. Большая Мощаница, 1998 г.р., неработающих, не судимых, которые в ночь на 23 августа по ул. Якубовского из вагончика на территории домовладения местного жителя, 1969 г.р., похитили велосипед «Аист» стоимостью 500 000 руб. Похищенное изъято. Раскрыто ОУР.

ВУП Беларусі ў студзені-ліпені знізіўся на 4%

І склаў амаль 483 трыльёны рублёў.

У студзені-ліпені 2015 года валавы ўнутраны прадукт Беларусі ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года знізіўся на 4% і склаў амаль 483 трыльёны рублёў, перадае БЕЛТА.

Праўда, Белстат удакладняе, што ВУП склаў 96,5% з улікам таго, што Міністэрства сельскай гаспадаркі зглядзіла тэрміны пачатку ўборкі збожжа.

Прадукцыйнасць працы па ВУП склалася на ўзроўні Br90 млн.

Прамысловай прадукцыі за гэты час выраблена больш за 412 трыльёнаў рублёў. Гэта на 7,2% менш, чым за студзень-ліпень 2014 года.

Сельскагаспадарчай прадукцыі (у гаспадарках усіх катэгорый) выраблена амаль на 57 трыльёнаў рублёў. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года падзенне склала 11,5%.

БУЛЬБЯНЫ ЎРАДЖАЙ ЛУКАШЭНКІ — «ЭЛІТНЫ» І МІЗЭРНЫ

Усьлед за Аляксандрам Лукашэнкам пахваліцца сваім ураджаем бульбы наважыўся і жыхар Шклоўскага раёну кандыдат эканамічных навук Пётар Мігурскі.

Жыве ён у вёсцы і забясьпечвае свойскай бульбай чатыры сям'і. Гаспадар дваццаці сотак агароду цьвердзіць: эфэктыўнасьць ягонай працы вышэйшая за прэзыдэнцкую. На ягоную думку, кіраўнік дзяржавы мусіць больш дбаць пра дабрабыт беларускага народу, а не займацца сумнеўным піярам сваёй гаспадарчай дзейнасьці.

Пётар Мігурскі — жыхар вёскі Дабрэйка Шклоўскага раёну. Чалавек ён вядомы ня толькі сярод аднавяскоўцаў, але і сярод сваіх калег аграрнікаў. Некалі кіраваў мясцовым калгасам, займаўся фэрмэрствам ды выкладаў эканамічныя дысцыпліны ў Магілёўскім унівэрсытэце харчаваньня. Ягоная дасьведчанасьць у сельскай гаспадарцы запатрабаваная.

Нярэдка ён выступае экспэртам у праектах грамадзкіх арганізацыяў.

«У мяне з дваццаці сотак агароду дзевяць займае бульба. Гэта трыццаць восем баразёнак. З кожнай маю па два мяхі бульбы. Зьбяру ня менш за 80 мяхоў», — прагназуе свой бульбяны ўраджай Пётар Мігурскі.

«Паводле маіх разьлікаў, прэзыдэнцкі ўраджай бульбы склаў меней за 163 цэнтнэры з гектару. А гэта дужа сьціпла, — разважае суразмоўца. — Многія ж раёны ў Беларусі зьбіраюць больш за 300 цэнтнэраў з гектару. У мяне ж ураджайнасьць — 369 цэнтнэраў. Гэта нармальная сярэдняя ўраджайнасьць бульбы для асабістай падсобнай гаспадаркі».

Пётар Мігурскі капаць бульбу пакуль не сьпяшаецца, аднак, як ён кажа, для «кухонных патрэбаў» патроху яе выбірае.

На бульбяное поле сям'ёю зьбіраецца празь месяц. Бульбоўнік пакуль ня зжух, адзначае гаспадар. Стаіць зялёным.

Суразмоўца падкрэсьлівае: бульбу высаджвае і капае традыцыйна, па-вясковаму, канём.

«Мы не выкарыстоўваем дарагія дэфіцытныя гаруча-змазачныя матэрыялы ды тэхніку, не наймаем людзей, — даводзіць ён.

— А ў прэзыдэнта мы бачым, што бульба высаджвалася саджалкай. Акрамя таго, прэзыдэнту, відаць, не высаджвалі бульбы масавых гатункаў. Гэта былі элітныя гатункі. І калі я бачу, што эліта дала такі вынік, то я не зусім разумею, навошта было рэклямаваць неэфэктыўны вынік такой працы. Я б у працы палітыка зьвяртаў увагу на куды больш важны складнік яе выніку — узровень дабрабыту народа, а ён у нас падае».

Не пад кожным бульбяным калівам на полі Мігурскага клубні былі буйнымі, і іх было шмат. Траплялася і нямала драбнаты. Яе, даводзіў гаспадар, скарыстаем на корм жывёле. Не прамінаў ён, уздымаючы каліва, адзначаць, што яго бульба яшчэ расьце.

Паводле суразмоўцы, чакаць сёлета вялікага ўраджаю бульбы і іншых сельскагаспадарчых культур не выпадае, бо год выдаўся неспрыяльны для іх.

«Завысокія былі тэмпэратуры, бракавала вільгаці, — тлумачыць ён. — Калі кажуць, што ўраджайнасьць зерневых, да прыкладу, будзе гэткай ж, як і летась, то я ў гэта ня веру, бо ня тыя ўмовы. Аднак, зь іншага боку, для нармальнага гаспадара ўмовы надвор'я не настолькі вызначальныя. Сучасныя тэхналёгіі дазваляюць атрымліваць высокія ўраджаі пры любых абставінах. Павінны выкарыстоўвацца найноўшыя тэхналёгіі, распрацаваныя на навуковай базе».

Адгарнуўшы чарговае каліва, суразмоўца працягнуў разважаць над сюжэтам пра бульбяны ўраджай Аляксандра Лукашэнкі.

Заўважае, што некаторыя ягоныя знаёмцы наважваліся яму выказваць сваё стаўленьне да ўбачанага, і яно было ня дужа пазытыўным:



«Сяляне пасьмейваліся ды падзівіліся, як прэзыдэнт, аграрнік, які мусіў разьбірацца ў такіх справах і дапусьціў, каб гэтак нязграбна выглядаць. І тое, што сын Коля па полі бегаў, нібы галоўны бульбавод краіны, і што ў белай вопратцы бульбу капалі, і тое, што на полі сабраліся бізнэсмэны...», — пераказвае словы сялян Мігурскі.

Ён лічыць: гаспадарамі на зямлі застаюцца фэрмэры і падсобныя прыватныя гаспадаркі. Яны робяць значны ўнёсак у трываласьць харчовай бясьпекі краіны, нягледзячы на неспрыяньне з боку чыноўнікаў:

«Калі пачалі змагацца з падсобнымі прыватнымі гаспадаркамі літаральна з 1995 году, то яны не ўлічылі, што ілюзія пасьпяховасьці сельскагаспадарчай вытворчасьці базавалася на аб'ёмах вытворчасьці ў прыватных сельскіх гаспадарках.

Тады малака выраблялі да 60 працэнтаў, мяса ад 45 да 65 працэнтаў. Тады гэтыя гаспадаркі фармавалі харчовы кош беларускага насельніцтва. Пачалі зьнішчаць вытворчасьць сельскагаспадарчай прадукцыі, якая дагэтуль трымаецца на прыватнай форме ўласнасьці і на асабістым працоўным удзеле сялян, і ўся сельская гаспадарка кожны год патрабуе ўсё больш фінансавых укладаньняў з боку дзяржавы, і пэрспэктываў у такой сельскай гаспадаркі няма».

Пётар Мігурскі свойскую бульбу падзеліць з сваімі дзецьмі. Прадаваць яе не зьбіраецца. Пакуль гутарылі зь вяскоўцам, ён накапаў, як выказаўся, прэзыдэнцкі мех бульбы — 42 кілаграмы.

(Заканчэнне на стар. 7)

ГЕНАДЗЬ ФЯДЫНІЧ: «ДАРМАЕДЫ», НЕ ПЛАЦІЦЕ ПАДАТКІ І СПІЦЕ СПАКОЙНА!

Калі сумна вядомы дэкрэт №3 «Аб дармаедах» нельга скасаваць намаганнямі незалежных прафзвязаў і апазіцыі - значыць, яго трэба зрабіць не дзейсным.



Старшыня Беларускага прафзвязу радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП) Генадзь Фядыніч заявіў пра гэта ў інтэрв'ю «Радыё Рацыя».

Генадзь Фядыніч мяркуе, што ў час рэалізацыі закона «Аб дармаедах» можа пайсці «ланцуговая рэакцыя», калі ў беспрацоўных людзей і без таго не стане грошай на ўтрыманне сям'і. Тады ў іх скончыцца цярпенне, як гэта адбылося ўжо падчас нядаўняга страйку ў Маладзечне. Толькі цяпер усё можа прыняць масавы характар.

- Можна сказаць, што мы перажываем «экватар» - яшчэ палова тэрміну і пачнецца прымяненне закона «Аб дармаедах»?

- Мяркую, што дэкрэт несвоечасовы і зусім не патрэбны. Колькі беспрацоўных сёння дзяржава можа ўладкаваць на біржы? Блізу 28 тысяч. Зарэгістраваныя ж 46 тысяч!

- Тым больш, масавае скарачэнне тых, хто раней рэгістраваўся і ўжо ні ў што не верыць?

- Безумоўна! Відавочна, што дзяржава імпатэнт - не бачыць, як іншым чынам забраць грошы ў людзей! Кажуць, у асяроддзі Мясніковіча «навучаныя думаць дзёрзка» чыноўнікі падлічылі, што будзе як мінімум больш за 300 тысяч «дармаедаў», памножылі іх на штрафныя мільёны і - атрымалі мільярды, якія нідзе не трэба шукаць!

Але хіба падумалі-падлічылі, колькі «жывых» грошай прывозяць у краіну гастарбайтэры, якія працуюць у Расеі - тыя ж ПДВ тут асядаюць! І калі праз іх глупства перастануць туды ездзіць, пакупніцкая здольнасць жыхароў тут апынецца на нулі. Хутка пагалоўна будуць ездзіць «зайцамі» у аўтобусах, бо дзяржава для гэтага ўсё робіць! Другі крок - стануць пытацца, за што жыў, за што будаваўся?

- Вы б раілі не плаціць?

- Не плаціць! Нельга здзекавацца з людзей. Грамадзянін павінен пастанаўляць сам - працаваць яму ці не, па тых ці іншых прычынах. А дзяржава абавязана стварыць яму ўмовы для працы і каб ён за яе атрымліваў добрыя грошы. Інакш, за што ты бярэш мільёны - за тое, што 183 дні пражыў, дыхаў гэтым паветрам, глядзеў на абрыдлыя тыпавыя будынкі на вуліцах?!

Няма ў свеце такой бязглуздзіцы, як з дэкрэтам №3! Гэта як браць падаткі з пінгвінаў у Антарктыдзе за тое, што яны там водзяцца... Між іншым, знаёмых украінцаў ужо папярэджвалі, што калі не ўладкуюцца - дэпартацыя! Каб усе пабеглі на працу за паўтара-два мільёны. А пенсіянерам - на галечу - дадалі па 130 тысяч, якіх не хопіць і на праязны па Менску! Упэўнены - дэкрэт не спрацуе!

- Тым больш, гадзіна «Ч» павінна наступіць пасля выбараў, калі, паводле прагнозаў спецыялістаў, стане значна горш эканамічна. Думаеце, Лукашэнка падставілі альбо гэта яго свядомая ініцыятыва?

- Тое, што «зляцеў» Мясніковіч - мяркую, адзін з адказаў. Чыноўнікі беспадстаўна сказалі, што яшчэ не ўсе грошы пакінулі ў крамах, не ўсе заплацілі штрафы і падаткі ў мясцовыя бюджэты. А тут вунь, маўляў, якая дармаўшчынка! Ды і сам Лукашэнка відавочна старэе, калі знакамітая палітычная інтуіцыя не падказала яму, што прымаць такі закон перад выбарамі - сабе даражэй! Таму яшчэ ўбачым, як людзі прыйдуць на тыя «выбары»!

- «Дармаеды» пасля гэтага інтэрв'ю могуць спаць спакайней?

- «Дармаеды», спіце спакойна, ніякіх падаткаў не плаціце!

БУЛЬБЯНЫ ЎРАДЖАЙ ЛУКАШЭНКІ — «ЭЛІТНЫ» І МІЗЭРНЫ

(Заканч. Пачатак на стар. 6)

Аляксандар Лукашэнка капаў бульбу ў сваёй рэзыдэнцыі ў Драздах у пазамінулыя выходныя. Паводле прэсавага сакратара кіраўніка дзяржавы Натальлі Эйсмант: «З участкам 18 сотак справіліся за паўтары гадзіны. Ураджай парадаваў — сем дзясяткаў мяхоў бульбы». Заяўлялася, што скапаная гародніна будзе перададзеная ў дзіцячыя дамы і дамы для састарэлых. Разам з Аляксандрам Лукашэнкам капаў бульбу і ягоны малодшы сын Мікалай. Дапамагала ім немалая грамада народу.

Радыё Свабода

НУ, ЗА ВЫБАРЫ!

(Заканчэн. Пачатак на стар. 1)

Надо протереть дырку. В том, в чем раньше мы стеснялись на улицу выходить, сейчас ходят. Давайте уже не будем протирать эти дырки, будем ходить в белорусском, нормальном белье, одежде, полотенца будем использовать белорусские и пищу белорусскую".

Тут я цалкам з кіраўніком краіны пагаджуся – нятрэба нам хадзіць у буржуінскай вопратцы і есці варожыя прадукты, лепш апрануць сваё, беларускае, і з'есці родны кавалак сала. Праўда, калі больш уважліва глянеш на прадукцыю нашых слаўных працаўнікоў лёгкай прамысловасці, а асабліва на яе кошт, то ногі чамусьці адразу ж накіроўваюцца на рынак, каб набыць замежнае "барахло", аднак нашмат танней. Ну а пра кошты на прадукты я наогул лепш проста прамаўчу.

Да таго ж, сам Аляксандр Рыгоравіч разам з Мікалаем Аляксандравічам нават бульбу на ўласным гародзе капаў чамусьці зусім не ў беларускім трыкатажы. Ды і перад баранавіцкімі працаўнікамі кіраўнік краіны выступаў, як заўважылі "нячэсныя" журналісты, апрануўшы на руку не беларускі "Прамень", а вельмі-такі не танны швейцарскі гадзіннік Vacheron Constantin, прыкладным коштам у 15000 – 20000 долараў (у залежнасці ад мадэлі). Але ж на тое ён і кіраўнік…

Парадаваў Рыгоравіч і "няшчасных" школьнікаў, якім нібыта задаюць шмат вельмі складаных хатніх заданняў. Цяпер трэба чакаць, што школьную праграму зноў спросцяць. Яно і зразумела, навошта беларускім дзеткам наогул вучыцца, бульбу на гародзе і так капаць можна. Ну а нешта разумнае няхай гэтыя амерыканцы, японцы ды кітайцы робяць. Аднак зноў жа ўзнікае пытанне – хто ж тады будзе рабіць канкурэнтназдольную беларус-



кую прадукцыю, каб яе куплялі, як хоча Рыгоравіч? Яшчэ больш кітайцаў прывязём?

Ну і асабліва парадаваў Рыгоравіч клопатам пра беларускіх вытворцаў гарэлкі і яе спажыўцоў, зараз гэты "якасны" прадукт можна набыць нашмат прасцей у любы час. Тут таксама ўсё зразумела, кільнуў пару-тройку кілішкаў гарэлкі – здаецца, жыццё наладзілася, можна ісці галасаваць "за стабільнасць", бо на цвярозае вока чамусьці яна не вельмі захапляе…

Вынікі "выбараў" у Беларусі даўно вядомыя, аднак карцінку прыгожую ўсё-роўна ствараць трэба для "праклятых буржуінаў", бо грошы ж вельмі патрэбныя. Таму ўлады вызначыліся з "альтэрнатыўнымі" кандыдатамі, якімі будуць Сяргей Гайдукевіч, Мікалай Улаховіч і Таццяна Караткевіч, і якія ніколі лішняга не ляпнуць. Ну а што будзе пасля "выбараў", можна толькі здагадвацца…

Іван Барысаў

МЫСЛИ

Ну, что за мысль на ум приходит!
Мыслишка, скажем, ерунда…
Она уходит, вновь приходит,
Что кушать хочется всегда.
Голодный муж по кухне бродит…
Поесть бы дать. Хоть иногда!
Любовь приходит и уходит,
А кушать хочется всегда.
Опять верхи нас за нос водят,
Без президента, мол, беда!
А он пришёл и не уходит…
И кушать хочет он всегда.
Теперь компанию проводят.
В поддержке вашей есть нужда!
И глубже в омут нас заводят,
А кушать хочется всегда.
Добили нас до ручки, вроде,
И в деревнях, и городах.
Уже последнее уводят,
А кушать хочется всегда.
Шальная мысль на ум приходит,
Вот автомат бы кто-то дал!
С ума народ наш что ли сходит,
Что кушать хочет он всегда.
А чтоб не быть такой заботе,
Товарищи и господа,
Пора подумать о народе,
Чтоб сытым был народ всегда!

Зинаида Милещенко

Анекдот дня

Только соберешься разбогатеть — то за квартиру платить надо, то туфли порвутся.

Крепостное право — это гарантированные рабочие места и уверенность в завтрашнем дне.

ИЗ СВОДКИ УВД

25 августа Белыничским РОСК возбуждено у/д по ст. 206 ч. 1 УК (Грабеж) в отношении не судимого, жителя Белыничского района, 1951 г.р., который 18 августа около 18-00 находясь в доме односельчанки пенсионерки, 1937 г.р., из кошелька открыто похитил 200 тыс. руб. Раскрыто СОГ. Похищенное изъято.

1 сентября СК возбуждено у/д по ст. 328 ч. 1 УК в отношении неработающего, ранее судимого по ст. 328 УК жителя г. Шклова, 1972 г.р., который 31 августа в 17-30 в лесном массиве вблизи ул. Железнодорожной хранил при себе 19,26 гр. маковой соломы. Раскрыто ОДО, ГНиПТЛ, ОУР. Задержан в порядке ст. 108 УПК.

27 августа СК возбуждено у/д по ст. 205 ч. 2 УК (Кража) в отношении жительницы д.Подгайцы, 1974 г.р., жителя д. Локути Шкловского района, 1983 г.р., неработающих, ранее судимых по ст. 205 УК, которые 25 мая около 23-00 в д. Плещицы, находясь в гостях у пенсионерки, 1935 г.р., после совместного распития спиртных напитков, похитили 900 000 руб.

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: 213173, Магілёўская вобл., Бялыніцкі р-н, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Падпісана ў друк 03.09.2015 г. у 09-00.